# ФАРМІРАВАННЕ Ў МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ КАМУНІКАТЫЎНЫХ УМЕННЯЎ ПРАЗ ВЫКАРЫСТАННЕ ГРУПАВОЙ ПРАЦЫ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

***Вашкевіч М.А.,***
*студэнтка 3 курса БрДУ імя А.С. Пушкіна, г. Брэст, Рэспубліка Беларусь*
Навуковы кіраўнік – Канцавая Г.М., канд. філал. навук, дацэнт

Сёння перад настаўнікам стаіць задача навучыць малодшых школьнікаў самастойна думаць, працаваць у камандзе, слухаць і чуць субяседніка, адстойваць свае погляды, свабодна і дакладна выкладаць свой пункт гледжання на праблему, што ў далейшым будзе садзейнічаць іх паспяховай самарэалізацыі ў розных відах дзейнасці.

Актуальнасць праблемы фарміравання камунікатыўных уменняў у малодшых школьнікаў абумоўлена пераходам ад традыцыйнага рэпрадуктыўнага метаду навучання да новай канструктыўнай кампетэнтнаснай мадэлі адукацыі, якая забяспечвае фарміраванне ў вучняў навыкаў станоўчага ўзаемадзеяння ў соцыуме.

Мэта – апісаць групавыя формы працы на ўроках беларускай мовы, якія садзейнічаюць фарміраванню камунікатыўных уменняў вучняў, развіццю ў іх супрацоўніцтва.

**Матэрыял і метады.** У нашым даследаванні выкарыстоўваецца літаратура па праблеме фарміравання ў малодшых школьнікаў камунікатыўных уменняў праз групавыя формы працы на ўроках беларускай мовы. Выкарыстаны метады аналізу, сінтэзу і абагульнення навукова-метадычнай літаратуры па разглядаемай праблеме.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Камунікатыўныя ўменні, паводле А.Р. Асмолава, – гэта “асэнсаваныя камунікатыўныя дзеянні дзяцей (на аснове ведання структурных кампанентаў уменняў і камунікатыўнай дзейнасці) і іх здольнасць правільна будаваць свае паводзіны, кіраваць імі ў адпаведнасці з задачамі зносін” [1].

Змест прадмета “Беларуская мова” накіраваны на фарміраванне першапачатковых камунікатыўных уменняў для абмену інфармацыяй, умення працаваць з тэкстам як маўленчым матэрыялам, разуменне сэнсу выразаў і выкарыстання іх у канкрэтных выпадках. Малодшы школьнік павінен авалодаць комплексам камунікатыўных дзеянняў: умець ставіць пытанні і даваць поўныя адказы на іх, быць актыўным у абмеркаванні разглядаемых праблем і аргументаваць свае меркаванні, узаемадзейнічаць з субяседнікам у працэсе дыялогу, даваць крытычную ацэнку выказванню субяседніка і каменціраваць яго.

Спынімся на групавых формах працы, якія накіраваны на фарміраванне камунікатыўных уменняў малодшых школьнікаў і характарызуюцца ўзаемадзеяннем вучняў адзін з адным, у працэсе якога дзеці становяцца актыўнымі суб’ектамі ўласнага навучання [2].

На ўроку абагульнення ведаў пра дзеяслоў клас можна падзяліць на групы. Кожная група атрымлівае заданне вызначыць спражэнне дзеясловаў, знайсці памылку ў напісанні дзеясловаў, уставіць прапушчаныя літары ў канчатках дзеясловаў і інш. У групавой дзейнасці трансфармуецца характар узаемаадносін паміж малодшымі школьнікамі, узнікае разуменне іншых і самога сябе, а таксама фарміруецца ўменне ўзгадняць пазіцыі членаў групы ў працэсе работы над заданнем і яго выкананнем. Вучні імкнуцца ясна і выразна выкладаць уласны пункт гледжання, аргументаваць свой адказ пры выкананні задання. Вынікі ўсіх груп фіксуюцца і потым абмяркоўваюцца. На заключным этапе ўрока малодшыя школьнікі адказаюць на пытанні “Якое заданне было самым цікавым? А якое самым цяжкім? Каго б вы хацелі пахваліць? Ацаніце сваю працу на ўроку”.

Цікавай групавой формай працы з’яўляецца падрыхтоўка газеты “Дзеяслоў” на ўроку па тэме “Неазначальная форма дзеяслова”. Кожнае заданне выконваецца ў групе згодна з рубрыкай газеты. Так, “аддзел навін” прапануе малодшым школьнікам выпісаць дзеясловы, вызначыць час, асобу, лік, а ў дзеясловаў прошлага часу – род. Аднак вучні пры выкананні сустракаюцца з дзеясловамі, у якіх яны не могуць выз-

начыць ні час, ні лік, ні асобу, ні род. Гэта дзеясловы ў неазначальнай форме. Толькі пасля тлумачэння настаўніка малодшыя школьнікі ставяць да такіх дзеясловаў пытанні, вызначаюць, на што яны заканчваюцца, і гэтую навіну публікуюць у газеце "Дзеяслоў".

"Аддзел інфармацыі" публікуе артыкул з фразеалагічнымі адзінкамі *павесіць галаву, прыкусіць язык, зарубіць на носе, вадзіць за нос, лынды біць.* Задача вучняў – патлумачыць значэнне фразеалагізмаў, замяніць іх дзеясловамі (для даведак: прамаўчаць, сумаваць, запомніць, падманваць, гультаяваць) і даказаць, што яны маюць неазначальную форму.

Малодшыя школьнікі, якія выконваюць функцыі карэктара, атрымліваюць заданне знайсці і выправіць памылкі ў наступных выказваннях: кіт наплакаў, соду ў рэшаце насіць, вакол нагі абвесці, зарубіць на пальцы. Выкарыстанне розных спосабаў працы пры выпуску газеты "Дзеяслоў" садзейнічае ўзаемадзеянню вучняў адзін з адным, супрацоўніцтву і высокай групавой актыўнасці малодшых школьнікаў.

На ўроках працы над памылкамі можна прапанаваць вучням наведаць "Арфаграфічную кавярню", у якой пяць сталоў (5 груп, якія працуюць над пэўнай арфаграмай). Вучні выбіраюць таксама эксперта, які, на іх думку, аб'ектыўны, мае больш высокі ўзровень ведаў і можа праверыць заданне, выкананае аднакласнікамі, знайсці і растлумачыць дапушчаныя памылкі. Група вучняў, якая па чарзе працуе за кожным з пяці сталоў, паўтарае ўсе арфаграмы, выпраўляе памылкі, запаўняе "ліст самаацэнкі" і збірае карткі-памочніцы. Малодшыя школьнікі параўноўваюць свае карткі-памочніцы з эталонам, ацэньваюць працу з выкарыстаннем тэхнікі "сігналы рукой", якая дазваляе настаўніку ўбачыць, ці ўсё вучням зразумела або ў іх ўзніклі цяжкасці. Вучні-эксперты даюць ацэнку як сваёй выкананай рабоце, так і групам, якія іх наведалі. Для замацавання тэмы "Тыпы тэкстаў" з мэтай фарміравання камунікатыўных уменняў у калектыўна-групавой дзейнасці можна клас разбіць на 4 групы і прапанаваць кожнай заданні: скласці кластар "Тыпы тэкстаў"; скласці сказы на тэму "Вясна" з выкарыстаннем апорных слоў да кожнага тыпу маўлення (апісання, апавядання, разважання).

**Заключэнне.** Настаўнік, фарміруючы камунікатыўныя ўменні малодшых школьнікаў на ўроках беларускай мовы, стварае ў класе атмасферу добразычлівасці, узаемнай павагі і даверу, устанаўлівае сяброўскія сувязі паміж вучнямі, развівае іх актыўнасць, ініцыятыўнасць, адказнасць. Такая арганізацыя адукацыйнага працэсу дазваляе кожнаму вучню пачатковых класаў аб'ектыўна параўноўваць уласнае ўменне з уменнямі аднакласнікаў, супастаўляць сваё меркаванне з меркаваннямі іншых, аб'ектыўна ацэньваць сябе, дасягаць разумення і ўзаемадзеяння, працуючы ў пары, у групе.


1. Асмолов, А. Г. Как проектировать универсальные учебные действия в начальной школе. От действия к мысли : пособие / А. Г. Асмолов. – М. : Просвещение, 2008. – 151 с.
2. Королькова, Л. В. Групповые взаимодействия младших школьников / Л. В. Королькова // Нач. шк. – 2007. – № 2. – С. 13–17.


## ОСОБЕННОСТИ ВЗАИМООТНОШЕНИЙ «УЧИТЕЛЬ–УЧЕНИК» НА УРОКАХ ИЗОБРАЗИТЕЛЬНОГО ИСКУССТВА


***Водчиц А.Н.,***
*студентка 3 курса ВГУ имени П.М. Машерова, г. Витебск, Республика Беларусь*
Научный руководитель – Сенько Д.С., канд. пед. наук, доцент


Одна из актуальных проблем педагогики связана с общением учителей и учеников. Как общаться с детьми, чтобы они учились? *«Речь взрослых в значительной степени определяет судьбу ребенка»* (Хаим Г. Гинотт**).** Многие психологи обосновывают тесную взаимосвязь эмоционально-чувственную и интеллектуальную сферу сознания человека. Особенно она важна на уроках изобразительного искусства, которые имеют больше эмоционально-чувственное наполнение.